2. *Коменский, Я. А.* Избранные педагогические сочинения / Я. А. Коменский. – М. : Учпедгиз, 1955. – 656 с.

3. *Микрюков, В.* Патриотизм: к определению понятия / В. Микрюков // Воспитание школьников. – 2007. – Вып. 5. – С. 2–3.

4. *Паноў, С. В.* Францыск Скарына – усходнеславянскі і беларускі гуманіст і асветнік / С. В. Паноў // Матэрыялы па гісторыі Беларусі. – 8-е выд., перапрац. – Мінск, 2005. – С. 89–92.

5. *Пискунов, А. И.* Очерки по истории прогрессивной немецкой педагогики конца XVIII – начала XIX в. / А. И. Пискунов ; Акад. пед. наук РСФСР, Ин-т теории и истории педагогики. – М. : Изд-во Акад. пед. наук РСФСР, 1960. – 200 с.

6. *Снапкоўская, С. В.* Ля вытокаў народнай мудрасці : А. Я. Багдановіч і выхаванне сродкамі народнай педагогікі / С. В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1993. – № 6. – С. 87–93.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПАМЯТНЫЯ МАНЕТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА БАНКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ПРЫСВЕЧАНЫЯ ДЗЕЯЧАМ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

***Н. А. Лінькова,***
*аспірант кафедры сусветнай мастацкай культуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Нацыянальная валюта разам з гербам, сцягам і гімнам з'яўляецца неад'емным атрыбутам суверэннай дзяржавы.

У першапачатковы перыяд пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь у абароце былі грашовыя знакі Дзяржбанка СССР, а затым і Цэнтральнага банка Расіі. Па рашэнню ўрада Рэспублікі Беларусь у маі 1992 г. на тэрыторыі Беларусі былі ўведзены ў абарачэнне разліковыя білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь [1]. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пастановай ад 19 кастрычніка 1994 г. № 3326-XII «Аб плацежным сродку Рэспублікі Беларусь» адзіным законным плацежным сродкам Рэспублікі Беларусь аб’явіў беларускі рубель, а ў наяўным звароце – разліковы

білет Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Дадзенае рашэнне фактычна завяршыла працэс набыцця беларускім рублём статусу нацыянальнай грашовай адзінкі, а Нацыянальным банкам – статусу адзінага эмісійнага цэнтра дзяржавы [1].

Адным з галоўных састаўляючых паўнавартаснай сістэмы грашовага абароту з’яўляюцца металічныя грашовыя знакі (манеты). 27 снежня 1996 г. былі выпушчаны першыя манеты Рэспублікі Беларусь. Іх з'яўленне – вынік станаўлення суверэннай дзяржавы і яе эмісійнага інстытута [1]. З 1 ліпеня 2016 г. у абарот уведзены восем наміналаў манет – 1, 2, 5, 10, 20 і 50 капеек, а таксама 1 і 2 рублі ўзору 2009 г., якімі мы карыстаемся зараз.

Як вядома, манеты – каштоўная гістарычная крыніца для рознабаковага вывучэння эканамічнай і палітычнай гісторыі народаў, іх матэрыяльнай і духоўнай культуры. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь акрамя хадавых банкнот і манет, сучасны дызайн якіх вырашаны ў нацыянальным каларыце, штогод выпускае серыі памятных манет, у мастацкім афармленні якіх гэта якасць праяўляецца больш яскрава.

Памятная манета – гэта манета, выпушчаная галоўным чынам у памяць пра пэўную падзею. Памятныя манеты знаходзяцца ў звароце нароўні з хадавымі манетамі [5, с. 202]. Разам са сваёй асноўнай функцыяй як сродка абароту і плацяжоў манеты выконваюць яшчэ іншыя, другарадныя функцыі. Да іх адносяцца: эстэтычная функцыя (як твор мастацтва); функцыя помніка гісторыі і культуры. У такой сваёй якасці манеты з'яўляюцца аб'ектам нумізматыкі і калекцыяніравання [5, с. 159]. Нумізматыка мае не толькі дапаможнагістарычную, але і выхаваўча-патрыятычную ролю [2, с. 2].

Сярод серый памятных манет Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь найбольшую ўвагу нададзім манетам серыі «Гісторыя і культура Беларусі». Дадзеныя выпускі прымеркаваны да наступных памятных дат і падзей у гісторыі культуры Беларусі: 200-годдзя з дня нараджэння А. Міцкевіча,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

100-годдзя з дня нараджэння Г. П. Глебава, 100-годдзя з дня нараджэння М. Лынькова, 900-годдзя з дня нараджэння Еўфрасінні Полацкай, 120-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы, 120-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, 200-годдзя з дня нараджэння І. Дамейкі, 600-годдзя з дня нараджэння Соф'і Гальшанскай (Друцкай), 200-годдзя з дня нараджэння В. Дуніна-Марцінкевіча, 150-годдзя з дня нараджэння І. Буйніцкага, 120-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча, 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка, 200-годдзя з дня нараджэння Напалеона Орды і інш.

За сваю гісторыю беларускі народ даў свету шмат знакамітых дзеячаў гісторыі і культуры. Каб ушанаваць кожнага з іх, а нашчадкам адкрыць бліскучыя старонкі мінулага, серыя памятных манет «Гісторыя і культура Беларусі» з нагоды святкавання юбілеяў стварае партрэтную галерэю лепшых прадстаўнікоў беларускай асветы, літаратуры, тэатра, кіно, жывапісу, архітэктуры, навукі і іншых галін гуманітарнай дзейнасці [4, с. 66].

Разгледзім больш падрабязней памятныя манеты, прысвечаныя дзеячам гісторыі і культуры Беларусі, выпушчаныя Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь у перыяд з 1996 па 2018 г. Адзначым, што дызайн большасці манет быў распрацаваны мастакамі Беларусі. Часцей за ўсё ў якасці дэкору на іх выкарыстаны традыцыйны беларускі геаметрычны арнамент, але ёсць і выключэнні.

На кожнай манеце маецца пэўны малюнак і надпіс – легенда. Манета мае ліцавы бок (аверс), адваротны (рэверс), абрэз і рабро (гурт) [3, с. 115].

Разгледзім дадзеныя асаблівасці на прыкладзе памятных манет, прысвечаных 900-годдзю з дня нараджэння Еўфрасінні Полацкай. Манеты былі ўведзены ў абарот 4 чэрвеня 2001 г. Дызайн манет наміналам у 1 і 20 рублёў (выявы на манетах аднолькавыя) належыць беларускаму аўтару С. Заскевіч. На аверсе манет у крузе, абведзеным геаметрычным



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арнаментам, змешчана рэльефная выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, пад ім указаны год чаканкі (яна праводзілася на «Манетным двары Польшчы»); на срэбнай манеце – маса каштоўнага металу ў чысціні і проба сплаву; па крузе надпісы: у верхняй частцы – «Рэспубліка Беларусь», у ніжняй частцы на срэбнай манеце – «дваццаць рублёў», на медна-нікелевай – «адзін рубель». На рэверсе па цэнтры размясцілася рэльефная выява ўваходу ў келлю і крыжа Ефрасінні Полацкай, які з'яўляецца неацэннай святыняй беларускага народа (выканана на срэбнай манеце золатам), злева – надпіс: «Еўфрасіння. Полацк 900 год», справа – рэльефная выява фігуры асветніцы зямлі беларускай Еўфрасінні Полацкай [4, с. 75].

Разгледзім выявы на памятных манетах «В. Дунін-Марцінкевіч. 200 год» (2008) наміналамі ў 1 і 10 рублёў. Дызайн таксама выкананы С. Заскевіч. У цэнтры аверса размясціўся ў абрамленні тэатральных фіранак арнаментальны матыў слуцкага пояса, выкарыстаны ў ілюстрацыях кнігі твораў В. Дуніна-Марцінкевіча (такім чынам, ілюстрацыі з кнігі перамясціліся на металічную паверхню, а выява нацыянальнага скарба – слуцкага пояса падкрэслівае значнасць драматурга ў гісторыі беларускай культуры); уверсе – рэльефная выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, у верхняй частцы па крузе надпіс: «Рэспубліка Беларусь». На рэверсе ў цэнтры – рэльефная выява партрэта беларускага драматурга В. Дуніна-Марцінкевіча; справа – фрагменты тэатральных афіш; уверсе злева па крузе ў два радкі надпісы: «В. Дунін-Марцінкевіч» і гады жыцця «1808–1884».

Памятныя манеты «М. Багдановіч. 120 гадоў» (2011 г., дызайн С. Заскевіч): у абрамленні аверса выкарыстаны арнаменты, якія поўнасцю адпавядаюць афармленню зборніка вершаў паэта «Вянок»; на рэверсе злева змясціўся рэльефны малюнак партрэта класіка беларускай літаратуры М. Багда-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новіча; справа па крузе ў два радкі надпісы: «М. Багдановіч», «1891–1917» (гады жыцця) і арнаментальны матыў з васількоў.

Памятныя манеты «Напалеон Орда. 200 гадоў» (2007 г., дызайн О. Навасёлавай) таксама сумяшчаюць у сабе злучэнне выяў арыгінальных твораў знакамітага мастака і музыканта і цікавага сучаснага дызайнерскага рашэння. На аверсе манеты ўверсе – рэльефная выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, у цэнтры на стылізаваным нотным стане – фрагменты архітэктурна-ландшафтных пейзажаў Беларусі, выкананыя па малюнкам Н. Орды. На рэверсе у цэнтры змясцілася рэльефная выява партрэта Н. Орды, знакамітага мастака, кампазітара і публіцыста, на фоне кругавых ліній і хаатычна размешчаных нот; унізе – надпісы па крузе ў два радкі: «1807–1883» і «Напалеон Орда».

Мастацкае афармленне другіх памятных манет дадзенай тэматыкі вырашана аналагічна. Большасць з названых манет адчаканены ў Манетным двары Польшчы.

Такім чынам, мэта выпуску дадзеных памятных манет – паказаць дзеячаў, паспрыяўшых развіццю культуры і духоўнасці нашай краіны. Сярод іх асветнікі, кампазітары, мастакі, драматургі, пісьменнікі і паэты – усе тыя, чыя творчасць уздымала нашу краіну на ўзровень еўрапейскай і сусветнай культуры. Памятныя манеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь у яскравай вобразнай форме распавядаюць пра выдатных беларускіх дзеячаў мастацтва і самі па сабе ўспрымаюцца як твор мастацтва, помнік гісторыі і культуры. Трэба дадаць, што ў мастацкім афармленні памятных манет серыі «Гісторыя і культура Беларусі» ў якасці сімвалаў нацыянальнай культуры, акрамя нацыянальнага арнаменту беларусаў, выступаюць кветкі роднага краю (васількі, кветкі ільну і інш.), творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія іграюць ролю нацыянальных рэліквій у нашым грамадстве, такія як «Крыж Е. Полацкай», слуцкія паясы і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзначым, што асэнсаванне нумізматычнага матэрыялу, што застаўся беларускаму народу ў спадчыну ад яго слаўных продкаў і які з'яўляецца ў цяперашні час, патрабуе пэўнага досведу, кругагляду і любові да сваёй краіны і яе гісторыі.


*1.* Банкноты и монеты Национального банка Республики Беларусь. Общие сведения [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.nbrb.by/CoinsBanknotes. – Дата доступа: 20.03.2019.

*2. Гулецкі, Дз. У.* Манеты беларускай даўніны / Дз. Гулецкі. – Мінск : Беларусь, 2007. – 159 с. : іл.

*3. Зварич, В. В.* Нумизматический словарь / В. В. Зварич. – Львов : Вища школа, 1979. – 338 с.

*4.* Памятныя манеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, 1996–2006 : буклет-даведнік / Главное управление эмиссинно-кассовых операций, Управление информации ; сост.: М. Демина, В. Сосновский, А. Воробьева ; авт. текстов: Н. Борисенко, А. Дроздов. – Мінск : Транстэкс, 2008. – 215. : каляр. іл.

*5. Фенглер Х.* Словарь нумизмата : пер. с нем. / Х. Фенглер, Г. Гироу, В. Унгер. – М. : Радио и связь, 1982. – 328 с. : ил.


## ЗВУКИ ГОРОДА В КОМПОЗИТОРСКОМ ТВОРЧЕСТВЕ


***Е. В. Лисова****,*

*кандидат искусствоведения, доцент,*

*заведующий научно-исследовательским отделом*

*Белорусской государственной академии музыки*


Среди многообразия форм творческого самовыражения особый интерес в современном музыкальном искусстве представляет так называемое экологическое направление. К нему относят авторов, которые на разной эстетической и технологической платформе разрабатывают тему «человек и окружающая среда». Можно возразить, что о природе писали все и всегда, опосредованно передавая через пейзажные об-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ